# ТЭКСТ ДЛЯ ВОДГУКУ

## Загадка

Напярэдадні вайны хлопец з Дона стаяў дазорам на Бугу. Пасля, пад націскам ворага, ён адступаў, уведаў бяздонную горыч разгрому і палону. Уцёк з-за калючага дроту і прыпыніўся ў самай звычайнай беларускай вёсцы. Небагатыя ціхія людзі, з якіх і ён нядаўна пасмейваўся: «Бульба дробненькая, але многа!..» Яны накармілі яго і прыгрэлі. Разам з імі ён узяў неўзабаве вінтоўку, стаў партызанам. Разам з імі рабіў ён тое, што – збоку відней – і Радзіма, і ўвесь прагрэсіўны свет пачалі пасля называць гераізмам. Тут на гарачую кроў яго раны лягла халаднаватая чысціня палатна. «Кужэльненькага», як гаварыла беларуская маці, нястомная работніца, што плакала над ім. Замест ягонай – богведама, ці жывой? – мамані ў далёкай, таксама дзесьці зганьбаванай фашыстамі станіцы... Тут ён адчуў каханне – наша дзяўчына палюбіла яго, пайшла з ім з роднае хаты ў сцюдзёную пушчу...

Пасля – перамога! І ён не вярнуўся дахаты, на Дон. Хлопец нібы толькі цяпер заўважыў, як ён прырос да гэтай слаўнай лясной старонкі, як пасябраваў з людзьмі, якія памаглі яму выканаць святы абавязак савецкага чалавека. Вось ужо трынаццаць год узапар ездзіць ён у госці на ўсход, да роднага берага, да родных душ, і вяртаецца адтуль у Беларусь з тым самым дзіўным пачуццём – з дому едзе дадому, з радзімы цягне яго на радзіму... Дзве іх стала, ці што?..

*Янка Брыль*
*1957*